Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

№ 17
верасень
1936

Работніца і калгасніца

Беларусі

ЛЕНІНА

За здраду соцыялістычнай радзіме — вышэйшая мера пакарання

Пяць дзён разбірала Ваенная калегія Вярхоўнага Суда Саюза ССР справу подлых падонкаў грамадства — арганізатараў трацкісцка-зіноўеўскага блока Зіноўева, Каменева, Еўдакімава, Смірнова, Бакаева, Мрачкоўскага, Тэр-Ваганяна, Гольцмана, Рэйнгольда, Пікеля і інш.

Органы Народнага Камісарыята Унутраных спраў Саюза ўскрылі гэту подлую банду, якая падрыхтоўвала забойства правадыра працоўных вялікага Сталіна і яго слаўных паплечнікаў: тт. Кагановіча, Варашылава, Кірава, Жданава, Орджанікідзе, Косіора і Постышэва.

Следчымі органамі ўстаноўлена, што гэты трацкісцка-зіноўеўскі цэнтр, па непасрэднаму ўказанню знаходзячагася за граніцай Троцкага, арганізаваў забойства аднаго з лепшых барацьбітоў за комунізм, палкага большэвіка, усімі любімага Сяргея Міронавіча Кірава.

Усе ніці загавора аб забойстве таварыша Кірава вялі ад непасрэднага забойцы Нікалаева—Каталынава да Зіноўева, Каменева, Бакаева і іншых з гэтай тройчы прэзрэннай банды. Але тады яшчэ не ўсе факты былі выкрыты, не ўсе даныя меліся на руках следчых органаў, і таму подлым забойцам — арганізатарам трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра ўдалося часова захаваць сваю шкодную дзейнасць, сваю сувязь з фашысцкімі шпіёнамі і дыверсантамі.

Ворагаў народа злавілі з палічным. Жалкая кучка забойцаў сама вымушана была прызнацца ў сваіх злодзействах.

На судзе паступова разблытваўся клубок цяжкіх злодзеянняў заклятых ворагаў народа, якія ішлі на правакацыю, забойства з-за вугла, на шпіёнаж, здраду, ашуканства.

Усе гэтыя цяжкія праступкі злодзеі рабілі толькі ў імя таго, каб дабіцца асабістай улады. Гэтая шайка бандытаў кіравалася толькі звярынай злосцю да совецкага народа, толькі звярынай нянавісцю да генія і тварца шчаслівага жыцця працоўных — да таварыша Сталіна.

Совецкі суд ускрыў і паказаў усяму свету, што ўсю гэту банду подлых забойцаў купіў фашызм і зрабіў іх сваімі наймітамі, каб іх подлымі рукамі забіць правадыроў соцыялізма, забіць таго, чыё імя з любоўю і адданасцю вымаўляюць народы Совецкага Саюза і ўсе працоўныя за мяжой.

Патрэбна была не толькі подласць, але і глупасць, каб імкнуцца захапіць уладу ў краіне соцыялізма, у краіне, дзе народ цесна згуртован навокал партыі і ўраду, навокал сваіх правадыроў.

Раней гэтыя бандыты марылі аб правале соцыялістычнага будаўніцтва ў Саюзе ССР. Яны радаваліся ўсім нашым цяжкасцям, іх адзінай стаўкай былі голад, вайна, паражэнне. Вось якая была іх «платформа»!

На судзе яны самі прызналіся, што ўсе іх планы развеяны ўшчэнт. Нават нашым ворагам цяпер ужо ясна, што соцыялізм канчаткова перамог у нашай краіне, на адной шостай зямнога шара. І таму яшчэ мацней іх звярыная нянавісць да Совецкага народа.

На індывідуальным тэроры сышліся інтарэсы трацкістаў і зіноўеўцаў. Вось таму яны і арганізавалі тэрарыстычны трацкісцкі - зіноўеўскі цэнтр.

Совецкі суд ускрыў сувязь зіноўеўцаў з замежнай контррэволюцыйнай арганізацыяй Троцкага, іх сістэматычную сувязь з германскай фашысцкай ахранкай—гестапо.

Агенты Троцкага, якія перакідваліся ім у Совецкі Саюз для арганізацыі забойстваў, былі адначасова і агентамі фашысцкай гестапо. Контррэволюцыйная сувязь Троцкага — Зіноўева — Каменева—гестапо на судзе даказана бясспрэчна.

З абурэннем і гневам сачылі працоўныя Совецкага Саюза за паказаннямі падсудных аб іх злодзеяннях, аб тых, якія яны ўжо зрабілі, і аб тых, якія яны збіраліся зрабіць.

З усіх канцоў краіны Советаў у Маскву неслі ся тэлеграмы, поўныя гнева і абурэння. За вышэйшую меру здрады соцыялістычнай радзіме, за вышэйшую меру подласці і ашуканства народ патрабаваў вышэйшую меру пакарання — расстрэла бандытаў.

Голас народа з'яўляецца грознай прадасцярогай для той контррэволюцыйнай сволачы, якая яшчэ марыць надзець ярмо капіталізма на шыю працоўных Совецкага Саюза. Гора таму, хто адважыцца падняць руку на нашых правадыроў, на нашага Сталіна, які даў нам культурнае і заможнае жыццё!

У прэзрэннай банды забойц знайшліся і свае абаронцы. Здраднікі міжнароднага рабочага класа—лідэры Амстэрдамскага і II Інтэрнацыянала імкнуліся іх выгарадзіць. Старшыня соцыялістычнага рабочага Інтэрнацыянала Дэ-Брукер, яго сакратар Адлер, старшыня міжнароднай федэрацыі профсаюзаў Сітрын і яго сакратар Шэвенельс звярнуліся ў Соўнарком Саюза ССР з просьбай: «каб абвінавачаным былі забяспечаны ўсе судо-

выя гарантыі, каб ім было дазволена мець абаронцаў, зусім незалежных ад ураду, каб ім не былі вынесены смяротныя прыгаворы, і каб ва ўсякім выпадку, не прымянялася якая-небудзь працэдура, выключаючая магчымасць апеляцыі».

Гэта тэлеграма з'явілася грубым пасягацельствам на правы совецкага суда, ад якога працоўныя ўсяго свету чакалі самага жорсткага пакарання агідным здраднікам.

Совецкі народ правільна расцэньвае гэта контррэволюцыйнае выступленне, як яшчэ адзін доказ правільнасці тэзіса таварыша Сталіна аб тым, што трацкізм з'яўляецца перадавым атрадам міжнароднай контррэволюцыі.

Мы будуем новае соцыялістычнае грамадства ва ўмовах вострай класавай барацьбы. Вялікія перамогі соцыялізма выклікаюць яшчэ больш злосць у нашых ворагаў, якія гатовы скарыстаць усе бандыцкія сродкі, абы перашкодзіць нам будаваць яшчэ больш шчаслівае, заможнае жыццё. І таму ворагам народа не можа быць літасці.

Дзяржаўны абвінаваўца, пракурор Саюза ССР тав. Вышынскі патрабаваў для ўсіх 16 падсудных вышэйшай меры пакарання — расстрэла. Гэта цалкам саўпала з патрабаваннямі народа Саюза Советаў. Пролетарскі суд, улічыўшы ўсю суму злодзеянняў падсудных, улічыўшы патрабаванні ўсяго совецкага народа, вынес смяротны прыгавор гэтай бандзе забойц.

ЦВК СССР, куды асуджаныя мелі нагласць звярнуцца з просьбай аб памілаванні, адхіліў іх просьбу, і прыгавор прыведзен у выкананне.

Совецкі суд вынес адзінае правільнае рашэнне—знішчыць шаляных сабак. Сабакам сабачая смерць! — так адказваюць мільёны працоўных на прыгавор суда. Няхай над гэтым падумаюць тыя, хто яшчэ спадзяецца пахіснуць магутнасць совецкай дзяржавы! Тэрарыстаў і шпіёнаў у нас чакае толькі смерць. Вораг будзе раздаўлен бязлітасна, як раздаўлены главары трацкісцка-зіноўеўскай банды.

З вялікім задавальненнем сустрэлі працоўныя гэты прыгавор. К пачуццю гнева і абурэння супроць шайкі бандытаў дадалася глыбачайшая задаволенасць прыгаворам, у якім праявілася воля народа.

Працэс выклікаў у совецкім народзе вялікую хвалю яшчэ большай любві і адданасці да таварыша Сталіна, да мудрага правадыра ўсіх працоўных.

У гэтыя дні яшчэ больш глыбокімі сталі пачуцці ўдзячнасці да таварыша Сталіна, які даў працоўным нашай краіны радаснае і заможнае жыццё, які даў совецкаму народу шчасце вольнай працы.

Чытка абвінаваўчага заключэння па справе контррэволюцыйнай дзейнасці трацкісцка-зіноўеўскай фашысцкай банды. Менск, абутковая фабрыка імя Кагановіча.

Асабліва ўдзячна таварышу Сталіну жанчына—работніца і калгасніца.

Гэта таварыш Сталин вывеў жанчыну на шлях вольнага жыцця, на шлях сапраўднага роўнапраўя.

Па ініцыятыве таварыша Сталіна жанчына-калгасніца атрымоўвае адпачынак да радоў і пасля радоў.

Рукамі таварыша Сталіна ў праект новай Канстытуцыі ўнесен артыкул аб роўным праве жанчын в усімі працоўнымі Совецкага Саюза на працу, на адпачынак, на асвету і на соцыяльнае забяспячэнне.

Але адчуваючы радасць свайго шчаслівага жыцця, мы павінны памятаць, што яшчэ не ўсе варожыя гнёзды выкрыты і зруйнаваны. Толькі рэволюцыйная пільнасць дапаможа іх выявіць і знішчыць канчаткова.

Узмацнім рэволюцыйную пільнасць! Цясней згуртуемся навокал партыі Леніна—Сталіна, навокал любімага правадыра працоўных—таварыша Сталіна! Не дадзім ворагам народа шкодзіць нашаму соцыялістычнаму будаўніцтву!

Ба 05 7416

Працэс трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра

ПРЫГАВОР

Імем Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР у складзе старшынствуючага—старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР — армваенюрыста тав. Ульрых В. В. Членаў:—намеснікаў старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР—корваенюрыста тав. Матулевіч І. О. і дыўваенюрыста тав. Нікітчэнка І. Т.

Пры сакратары—ваенным юрысце першага ранга тав. **Касцюшка**, з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы пракурора Саюза ССР тав. **Вышынскага А. Я.**

У адкрытым судовым пасяджэнні ў горадзе Маскве 19—24 жніўня 1936 года разгледзіла справу па абвінавачванню:

1. **Зіноўева**, Грыгорыя Еўсеевіча, 1883 года нараджэння, служачага, асуджанага 16 студзеня 1935 г. па справе „Маскоўскага цэнтра" зіноўеўцаў па арт. 17—58—8 К. К. РСФСР да турэмнага зняволення на 10 год.

2. **Каменева,** Льва Барысавіча, 1883 г. нараджэння, служачага, асуджанага 16 студзеня 1935 г. па справе „Маскоўскага цэнтра", зіноўеўцаў па арт. 17—58—8 К. К. РСФСР да турэмнага зняволення на 5 год і ў другі раз асуджанага 27 ліпеня 1935 г. па арт. 17—58—8 К. К. РСФСР да турэмнага зняволення на 10 год;

3. **Еўдакімава,** Грыгорыя Ерэмеевіча, 1884 года нараджэння, служачага, асуджанага 16-га студзеня 1935 г. па справе „Маскоўскага цэнтра" зіноўеўцаў па арт. 17—58—8 К. К. РСФСР да турэмнага зняволення на 8 год;

4. **Бакаева,** Івана Петровіча, 1887 года нараджэння, служачага, асуджанага 16 студзеня 1935 года па справе „Маскоўскага цэнтра" зіноўеўцаў па арт. 17—58—8 К. К. РСФСР да турэмнага зняволення на 8 год;

5. **Мрачкоўскага,** Сяргея Вітальевіча, 1883 года нараджэння служачага;

6. **Тэр-Ваганяна,** Вагаршака Аруцюнавіча, 1893 года нараджэння, служачага;

7. **Смірнова,** Івана Нікіціча, 1880 года нараджэння, служачага—усіх семярых у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58—8 і 58—11 К. К. РСФСР.

8. **Дрэйцэра,** Ефіма Александравіча, 1894 года нараджэння, служачага;

9. **Рэйнгольда,** Ісаака Ісаевіча, 1897 года нараджэння, служачага;

10. **Пікеля,** Рычарда Вітольдавіча, 1896 года нараджэння, служачага;

11. **Гольцмана,** Эдуарда Саламонавіча, 1882 года нараджэння, служачага;

12. **Фрыца Давіда,** ён-жа **Круглянскі** Ілья-Давід Ізрайлевіч, 1897 года нараджэння, служачага;

13. **Ольберга,** Валенціна Паўлавіча, 1907 года нараджэння, служачага;

14. **Бермана-Юрына,** Канона Барысавіча, ён-жа Александр Фаміч, 1901 года нараджэння, служачага;

15. **Лур'е**, Майсея Ільіча, ён-жа **Эмель** Александр, 1897 года нараджэння, служачага;

16. **Лур'е,** Натана Лазаравіча, 1901 года нараджэння, служачага—усіх у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 19—58—8 і 58—11 К. К. РСФСР.

Папярэднім і судовым следствам устаноўлена: Увосень 1932 г. па дырэктыве **Л. Троцкага,** атрыманай кіраўніком трацкісцкага падполля ў СССР **І. Н. Смірновым,** адбылося аб'яднанне трацкісцкіх і зіноўеўскіх падпольных контррэволюцыйных груп, арганізаваўшых „аб'яднаны цэнтр" у складзе: **Зіноўева, Каменева, Еўдакімава** і **Бакаева** (ад зіноўеўцаў) і **Смірнова, Тэр-Ваганяна** і **Мрачкоўскага** (ад трацкістаў).

Аб'яднанне гэтых контррэволюцыйных груп было дасягнута на аснове прымянення індывідуальнага тэрору ў адносінах кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада.

Трацкісты і зіноўеўцы па прамых указаннях Троцкага, атрыманых „аб'яднаным цэнтрам" праз падсудных **Смірнова, Гольцмана** і **Дрэйцэра,**

У гэты перыяд часу (1932—1936 г. г.) сканцэнтравалі ўсю сваю варожую дзейнасць супроць совецкага ўрада і ВКП(б) па арганізацыі тэрору ў адносінах іх кіраўнікоў.

Судом устаноўлена, што „аб'яднаным цэнтрам" па прамых указаннях **Л. Троцкага** і **Зіноўева** было арганізавана і ажыццёўлена 1-га снежня 1934 года праз падпольную тэрарыстычную ленінградскую групу зіноўеўцаў **Нікалаева-Каталынава** зладзейскае забойства члена прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР і члена ЦК ВКП(б) тав. **Сергея Міронавіча Кірава**.

Не абмяжоўваючыся забойствам т. **Кірава**, трацкісцка-зіноўеўскі цэнтр падрыхтаваў рад тэрарыстычных актаў супроць таварышоў **Сталіна, Варашылава, Жданава, Кагановіча Л. М., Орджанікідзе, Касіора** і **Постышэва**.

Матэрыяламі судовага следства і прызнаннямі падсудных **Зіноўева, Каменева, Еўдакімава, Бакаева, Мрачкоўскага** і **Дрэйцэра** ўстаноўлена, што **Л. Троцкі** з-за граніцы і **Зіноўеў** унутры краіны ўзмоцнена фарсіравалі падрыхтоўку забойства **С. М. Кірава**. У мэтах фарсіравання забойства тав. **С. М. Кірава** ў чэрвені 1934 г. **Каменеў** па даручэнню аб'яднанага трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра ездзіў у Ленінград, дзе вёў перагаворы аб арганізацыі гэтага тэрарыстычнага акту супроць тав. **Кірава** з кіраўніком адной с ленінградскіх тэрарыстычных груп **Якаўлевым,** Справа аб якім выдзелена ў асобнае вядзенне. Судом таксама ўстаноўлена, што па даручэнню „аб'яднанага цэнтра" падсудны **Бакаеў** у лістападзе 1934 года таксама спецыяльна выязджаў у Ленінград для праверкі падрыхтаванасці ленінградскай тэрарыстычнай групы **Нікалаева-Каталынава** да правядзення забойства т. **Кірава**. На канспіратыўным сходзе членаў гэтай ленінградскай тэрарыстычнай групы **Бакаеў** заслухаў даклад забойцы т. **Кірава**—Леаніда Нікалаева і ад імя аб'яднанага трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра даў яму і яго суўдзельнікам рад практычных указанняў па арганізацыі забойства тав. **С. М. Кірава**. У адпаведнасці з гэтымі ўказаннямі Л. Нікалаеў і яго суўдзельнікі і ажыццявілі 1-га снежня 1934 г. зладзейскае забойства тав. **С. М. Кірава**.

Судом таксама ўстаноўлена, што ў 1934 г. падсудныя **Бакаеў, Рэйнгольд,** і **Дрэйцэр** у адпаведнасці з рашэннямі „аб'яднанага цэнтра", прабавалі двойчы зрабіць замах на таварыша **Сталіна**.

У мэтах найбольш паспяховага ажыццяўлення намечаных „аб'яднаным цэнтрам" тэрарыстычных актаў ім быў арганізован у 1933 годзе ў Маскве так званы „Маскоўскі тэрарыстычны цэнтр" у складзе падсудных **Рэйнгольда, Пікеля** і **Дрэйцэра,** пад непасрэдным кіраўніцтвам члена „аб'яднанага цэнтра" падсуднага **Бакаева.**

„Аб'яднаным цэнтрам" было даручана падсуднаму **Бакаеву** практычна падрыхтаваць ажыццяўленне забойства тт. **Сталіна** і **Кірава,** а члену „Маскоўскага тэрарыстычнага цэнтра" падсуднаму **Дрэйцэру** была даручана арганізацыя тэрарыстычнага акту супроць тав. **Варашылава**.

Не абмяжоўваючыся арганізацыяй пад непасрэдным кіраўніцтвам „аб'яднанага цэнтра" раду тэрарыстычных актаў суроць кіраўнікоў совецкай дзяржавы і ВКП(б), **Л. Троцкі** на працягу 1932—1936 гг. сістэматычна ў тых-жа мэтах перакідваў з-за граніцы ў СССР рад тэрарыстаў.

У лістападзе 1932 года **Л. Троцкім** былі перакінуты ў СССР **Берман-Юрын** і **Фрыц Давід,** прычым перад ад'ездам яны былі асабіста праінструктаваны **Л. Троцкім** па арганізацыі забойства тав. **Сталіна**.

У тым-жа 1932 годзе Л. Троцкім быў перакінут з Берліна ў Маскву тэрарыст Натан Лур'е. Разам з пражываўшым тады ў Маскве, пад выглядам замежнага спецыяліста, агентам гестапо і даверанай асобай Гімлера (цяперашняга кіраўніка гестапо) **Францам Вайцам** Натан **Лур'е** падрыхтоўвалі замах на забойства тт. **Сталіна, Варашылава, Кагановіча** і **Орджанікідзе.**

Зімой 1932—1933 года, пасля ад'езду Франца **Вайца** з Масквы, Натан **Лур'е** са сваёй тэрарыстычнай групай працягваў падрыхтоўку гэтых тэрарыстычных актаў сумесна з прыбыўшымі ў сакавіку 1933 года ў Маскву з Берліна падсудным Майсеем **Лур'е,** таксама атрымаўшым ад Троцкага заданне фарсіраваць тэрарыстычныя акты супроць кіраўнікоў совецкай улады і ВКП(б).

У 1934 годзе, знаходзячыся на Чэляббудзе, Натан Лур'е прабаваў зрабіць замах на жыццё тт. **Кагановіча** і **Орджанікідзе**. Нарэшце той-жа Натан Лур'е 1-га мая 1936 года, па заданню і папярэдняму ўзгадненню з Майсеям Лур'е, прабаваў зрабіць у час першамайскай дэманстрацыі ў Ленінградзе замах на тав. **Жданава.**

Летам 1935 года Л. **Троцкім** праз свайго сына Л. **Седава** быў перакінут з Германіі ў СССР тэрарыст В. **Ольберг,** які скарыстаў фіктыўны пашпарт падданага рэспублікі Гондурас. Гэты пашпарт В. Ольберг набыў пры дапамозе германскай тайнай паліцыі гестапо, атрымаўшы папярэднюю згоду ад Л. Троцкага праз яго сына Седава скарыстаць садзейнічанне ў гэтай справе германскай тайнай паліцыі.

В. **Ольберг** па прыбыцці ў СССР звязаўся з контррэволюцыйнай трацкісцкай тэрарыстычнай групай у г. Горкім і падрыхтаваў рад тэрарыстаў, якія павінны былі 1-га мая 1936 года ўчыніць у Маскве на Краснай плошчы тэрарыстычны акт супроць кіраўнікоў совецкага ўрада і ВКП(б).

Судовым следствам таксама ўстаноўлена, што трацкісцка-зіноўеўскі тэрарыстычны цэнтр адначасова з падрыхтоўкай тэрарыстычных актаў супроць тт. **Сталіна, Варашылава, Жданава, Кагановіча** і **Орджанікідзе** падрыхтоўваў тэрарыстычныя акты супроць тт. **Касіора** і **Постышэва** праз украінскую тэрарыстычную групу, якая дзейнічала пад кіраўніцтвам трацкіста **Мухіна,** справа аб якім выдзелена ў асобнае вядзенне.

Такім чынам устанаўляецца віноўнасць:

1. **Зіноўева Г. Е.**
2. **Каменева Л. Б.**
3. **Еўдакімава Г. Е.**
4. **Бакаева І. П.**
5. **Мрачкоўскага С. В.**
6. **Тэр-Ваганяна В. А.**
7. **Смірнова І. Н.**

у тым, што яны:

а) арганізавалі аб'яднаны трацкісцка-зіноўеўскі тэрарыстычны цэнтр для правядзення забойстваў кіраўнікоў совецкага ўрада і ВКП(б);

б) падрыхтавалі і ажыццявілі 1-га снежня 1934 года праз ленінградскую падпольную тэрарыстычную групу **Нікалаева-Каталынава** і іншых, асуджаных 29-га снежня 1934 г. Ваеннай калегіяй

Вярхоўнага суда Саюза ССР, зладзейскае забойства тав. **С. М. Кірава.**

в) арганізавалі рад тэрарыстычных груп, падрыхтоўваўшых забойства тт. **Сталіна, Варашылава, Жданава, Кагановіча, Орджанікідзе, Касіора і Постышэва,—**

г. зн. у злачынствах прадугледжаных арт. арт. 58—8 і 58—11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

8. **Дрэйцэра Е. А.**
9. **Рэйнгольда І. І.**
10. **Пікеля Р. В.**
11. **Гольцмана Э. С.**
12. **Фрыц Давіда (Круглянскага Ілы Давіда Ізрайлевіча).**
13. **Ольберга В. П.**
14. **Бермана-Юрына К. Б.**
15. **Лур'е М. І.** (Эмеля Александра).
16. **Лур'е Н. Л.,—**

у тым, што будучы членамі падпольнай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай трацкісцка-зіноўеўскай арганізацыі, з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі падрыхтоўкі забойства кіраўнікоў партыі і ўрада тт. **Сталіна, Варашылава, Жданава, Кагановіча, Орджанікідзе, Касіора і Постышэва,—**

г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 19—58—8 і 58—11 Крымінальнага Кодэкса РСФСР.

На падставе вышэй паданага і кіруючыся арт. арт. 319 і 320 Крымінальнага-працэсуальнага Кодэкса РСФСР, Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР

прыгаварыла:

1. **Зіноўева** Грыгорыя Еўсеевіча,
2. **Каменева** Льва Барысавіча,
3. **Еўдакімава** Грыгорыя Ерамеевіча,
4. **Бакаева** Івана Петровіча,
5. **Мрачкоўскага** Сергея Вітальевіча,
6. **Тэр-Ваганяна** Вагаршака Аруцюнавіча,
7. **Смірнова** Івана Нікіціча,
8. **Дрэйцэра** Ефіма Александравіча,
9. **Рэйнгольда** Ісаака Ісаевіча,
10. **Пікеля** Рычарда Вітольдавіча,
11. **Гольцмана** Эдуарда Саламонавіча,
12. **Фрыц** Давіда—**Круглянскага,** Ілью—Давіда Ізрайлевіча.
13. **Ольберга** Валенціна Паўлавіча,
14. **Бермана—Юрына** Конана Барысавіча,
15. **Лур'е** Майсея Ільіча—Эмеля Александра,
16. **Лур'е** Натана Лазаравіча—усіх да **вышэйшай меры пакарання—расстрэлу,** з канфіскацыяй усёй, асабіста ім належачай маемасці.

Знаходзячыйся ў сучасны момант за граніцай **Троцкі** Леў Давідавіч і яго сын **Седаў** Леў Львовіч, выкрытыя паказаннямі падсудных **Смірнова І. Н., Гольцмана Э. С., Дрэйцэра, В. Ольберга, Фрыц** Давіда **(Круглянскага І. І.)** і **Бермана-Юрына** і матэрыяламі данай справы ў непасрэднай падрыхтоўцы і асабістым кіраўніцтве арганізацыяй у СССР тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і совецкай дзяржавы, у выпадку іх абнаружэння на тэрыторыі Саюза ССР належаць неадкладнаму арышту і адданню суду Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР.

Старшынствуючы—старшыня Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР, армваенюрыст

В. УЛЬРЫХ.

Члены—намеснікі старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР: корваенюрыст

І. МАТУЛЕВІЧ.

Дыўваенюрыст І. НІКІТЧЭНКА.

Адзін прысуд—расстрэл

Майстры крывавай, воўчай справы,
Наш меткім быў заўжды прыцэл;
Усіх, чаргой, з падсуднай лавы
Мы павядзем вас на расстрэл!

Вы ўсе нянавісцю авіты,
На вас ляжыць крыві пячаць.
Ніякай літасці! Бандытаў
Прысуд народны:—расстраляць!

Хацелі ў сэрца ўлезці лапай,
Асіраціць хацелі нас.
Мы б'ем без промаху ў гестапо—
Калі мы б'ем, забойцы, ў вас!

***

Маўчыць гісторыя,
Вякі жыцця не знаюць
Такіх раз'юшаных людской пароды псоў.
Я гневам бацькаўшчыны горда заяўляю—
Апошні час мярзотнікам прышоў!

А наша сонца нам ярчэй заззяла,
Узнялося ўвысь,
І разлілося ўшыр.
Вядзі наперад нас, вядзі нас вал за валам,
Наш родны Сталін, бацька, правадыр.

Табе—любоў, табе—магутнасць наша,
Жыццё сваё мы зложым за цябе.
Ты—зодчы шчасця ў барацьбе бясстрашнай,
Ты—кліч, ты—сцяг у лютай барацьбе.

***

Сям'ёй стосемдзесятмільённай
Мы йдзем дарогай перамог.
Разбіць наш поступ, мур калонаў
Ні ў чым, нідзе ніхто не змог.

Не тращім пільнасць мы ў паходах,
Заўсёды меткі наш прыцэл.
Хто рвецца сэрца ўзяць народа
Таму адзін прысуд—расстрэл!

Андрэй Александровіч.

НІЯКАЙ ЛІТАСЦІ ДА ВОРАГАЎ НАРОДА

Газеты разносілі па ўсяму свету дзеннік суда над подлымі главарамі зіноўеўска-трацкісцкай зграі.

Сотні мільёнаў штодзённа з вялікай напружанасцю чыталі прызнанні фашысцкіх наймітаў. З кожным днём нарастала хваля вялікага гневу народнага. Няма ніводнага чалавека, які-б раўнадушна аднёсся да гэтага працэсу. Усе з хваляваннем чыталі пра ўскрытую подласць і гнуснасць трацкісцка-зіноўеўскага блока—гэтага перадавога атрада міжнароднай контр-рэволюцыі.

Хутка разматваўся клубок дзеянняў гэтых злосных ворагаў нашых. Гісторыя чалавецтва не ведае такой подласці. Суд ускрыў і паказаў усяму свету тыя ніці, якімі былі звязаны Зіноўеў, Каменеў і іншыя з Іудушкай Троцкім і германскай фашысцкай паліцыяй—гестапо.

Працэс ускрыў усю іх безідэйнасць і адзіную нізкую мэту—любымі шляхамі прабрацца да ўлады і прадаць капіталістам нашу краіну.

Злачынствы гэтай групы здраднікаў супроць народаў Совецкага Саюза вельмі вялікія. Рукі іх замараны крывёю забітага імі Сяргея Міронавіча Кірава.

Фашысцкія наймiты імкнуліся забіць правадыроў партыі і ўраду. Яны нават імкнуліся падняць руку на самаго вялікага Сталіна.

Але гэтыя агенты гестапо пралічыліся. Яны ў сваёй лютай нянавісці да краіны соцыялізма праглядзелі, што вакол вялікага Сталіна жывой сцяной стаіць совецкі народ. Фашысцкія наймiты не разлічылі, што кожны сын і дачка совецкага народа гатовы за Сталіна, за перамогу сталінскіх ідэй аддаць сваё жыццё.

Дзесяткі мільёнаў нясуць сцяг Леніна-Сталіна. Дзесяткі мільёнаў з любоўю глядзяць на вялікага Сталіна—тварца шчаслівага жыцця. Дзесяткі мільёнаў гатовы стаць на абарону любімага Сталіна і яго слаўных саратнікаў.

І ад таго так велізарна было абурэнне народа.

Па ўсяму Совецкаму Саюзу праходзілі мітынгі, сходы працоўных. Самай суровай кары патрабавалі працоўныя для тройчы прэзрэнных арганізатараў тэрарыстычных актаў, падонкаў грамадства, якія прадаліся фашыстам.

Падумаць толькі: Сталін даў нам вольнае, шчаслівае жыццё, Сталін—правадыр працоўных усяго света, а яны—подлыя гады імкнуліся забіць яго! Няма слоў, каб перадаць абурэнне наша.

Моладзь у песнях славіць імя Сталіна, які даў нам радаснае, шчаслівае жыццё. Але мы, старыкі, яшчэ ярчэй за моладзь адчуваем радасць ад гэтага нашага жыцця. Мы, якія вынеслі на сваіх плячах увесь цяжар царызма, мы асабліва ўмеем цаніць усё тое дабро, якое даў нам наш бацька—вялікі Сталін.

Колькі горкіх слёз прышлося праліць мне, пакуль я выхавала сваіх дзяцей. Сама я была круглай сіратой. Ледзь стала на ногі,—пайшла працаваць на кулакоў. Доўгія гады батрачыла. Вышла замуж за такога-ж батрака, як і сама. Батрачылі разам.

Тым-жа шляхам пайшлі і дзеці нашы, таму што другога шляху пры капіталізме няма. Як толькі старшаму — Колю — споўнілася 8 год, мы аддалі яго пасвіць кулацкіх кароў. Тое-ж самае было і з дачкой Кацяй.

Толькі пры совецкай уладзе я стала жыць па-людску. Паступіла на фабрыку. Муж таксама. Увесь час я была ўдарніцай. Зараз магу сказаць смела, што я—лепшая стаханаўка. Не гледзячы на тое, што мне 56 год, я выконваю новыя нормы на 130—140 проц. Маю і грамадскія нагрузкі: я нязменны член горсовета трох скліканняў.

І дзеці мае зараз людзьмі сталі. Старшы Коля—намеснік дырэктара Горкаўскага аўтазавода, дачка Каця працуе ў Наркамунешгандлі, а Пеця—на нашай фабрыцы. Ён таксама стаханавец, і сэрца маё радуецца, што ён актыўны член ленінскага комсамола.

Усе рабочыя нашай фабрыкі сачылі за працэсам над ворагамі працоўных. Усе былі напоўнены лютай нянавісцю да тройчы праклятых выродкаў. Усе мы патрабавалі для іх вышэйшай меры пакарання. Аднадушную думку і волю працоўных адлюстравала Ваенная Калегія Вярхоўнага суда, якая прыгаварыла да расстрэлу ўсіх шаснаццаць ашалеўшых сабак буржуазіі.

З вялікім задавальненнем успрынялі мы, рабочыя фабрыкі імя Куйбышава, справядловы прыгавор. Мы аднадушна вітаем гэты прыгавор.

Прыгавор суда правільны. Гады панеслі заслужанае пакаранне. Пролетарскі суд выканаў патрабаванне ўсяго совецкага народа.

Мы ўсе, рабочыя, яшчэ вышэй уздымем нашу большэвіцкую пільнасць. Мы будзем актыўна дапамагаць партыі выяўляць трацкісцка-зіноўеўскіх паследышаў і бязлітасна змагацца з імі. Мы яшчэ цясней згуртуемся вакол нашай партыі і любімага правадыра таварыша Сталіна.

Менск. **Гурына.**

ПРЫГАВОР СУСТРЭЛА З РАДАСЦЮ

Я ўважліва сачыла за судовым працэсам азвярэлых главароў тэрарыстаў, агентаў фашызма, тройчы прэзрэнных майстроў двурушніцтва, арганізатараў замаху на нашых любімых правадыроў, на нашага роднага Сталіна.

Замірала маё сэрца, калі я чытала паказанні гэтых паўзучых гадаў, што рыхтаваліся балюча ўкусіць сваім крывавым жалам палымнеючае сэрца 170 мільённага народа—нашага любімага Сталіна.

З вялікай радасцю я сустрэла прыгавор пролетарскага суда, які сурова пакараў гэтых гадаў. Так будзе з усімі, хто яшчэ будзе імкнуцца пасягнуць на жыццё нашых любімых правадыроў!

Мае два сыны—лейтэнанты слаўнай Чырвонай арміі—пільна ахоўваюць шчаслівую працу працоўнага народа сваёй соцыялістычнай радзімы і заўсёды гатовы аддаць сваё жыццё за сваю радзіму, за любімага, мудрага, роднага Сталіна. Я, як маці, у гэтым не сумняваюся!

Жонка рабочага завода „Большэвік“

МАКСІМАВА.

Менск.

ЖЫЦЦЁ СТАЛІНА ДАРАЖЭЙ ЗА ЎСЁ

Няма слоў, каб выказаць абурэнне дзеяннямі подлых гадаў—агентаў фашысцкіх ахранак Троцкага, Зіноўева, Каменева і іншых.

Каб уявіць сабе сілу гнева, напоўніўшага нашы сэрцы, трэба было бачыць твары старых і маладых работніц нашай фабрыкі ў часы мітынгаў і сходаў. Не інакш, як з абурэннем гаварылі у нас пра белабандыцкую зграю.

Сэрца сціснулася ад болю, калі я пачула, як прэзрэнныя фашысцкія іуды, подлыя тэрарысты, правакатары рыхтавалі замах на таварыша Сталіна—правадыра народаў, на таго, хто даў нам, совецкаму народу, шчасце, права на працу і на вясёлае і радаснае жыццё.

Столькі нянавісці і агіднасці было ў кожнага з нас да гэтых катаў, якія рабілі замах на жыццё чалавека, чыё імя з любоўю вымаўляюць сотні мільёнаў людзей! Імя Сталіна—гэта імя друга і настаўніка. Імя Сталіна звязана з усім тым, што ёсць лепшага ў свеце. Таму і мецілі гады ў таварыша Сталіна.

Але пралічыліся подлыя мерзаўцы! Пільныя вартавыя рэволюцыі, верныя вучні незабыўнага Фелікса Дзяржынскага своечасова выкрылі іх. Разбітыя, азлобленыя контррэволюцыянеры прыбеглі да апошняга, бандыцкага сродка барацьбы—да індывідуальнага тэрора. Подлыя рукі гэтай банды фашысцкіх забойцаў замараны былі крывёю палкага барацьбіта за комунізм Сяргея Міронавіча Кірава.

Я з нецярплівасцю чакала рашэння суда. Зладзеі, забіўшыя т. Кірава, рыхтаваўшыя замах на кіраўнікоў нашай краіны, павінны быць знішчаны. Такі прыгавор, такое жаданне было ў усяго народа. Другога прыгавора не павінна было быць, і пролетарскі суд улічыў гэта. Па заслугах атрымалі ворагі. Гады расстраляны.

Я з поўным задавальненнем сустрэла прыгавор суда. Ён цалкам адпавядае нашаму жаданню, кроўным інтарэсам краіны соцыялізма.

У адказ на рашэнне суда ўсе мы, моладзь фабрыкі, жалезнай сцяной яшчэ больш згуртуемся навакол партыі, каб у любы момант стаць на абарону сваіх правадыроў, сваёй бацькаўшчыны.

У імя соцыялізма, які перамог у нашай краіне, у імя партыі, у імя геніяльнага правадыра рэволюцыі т. Сталіна—мы будзем будаваць нашу лепшую будучыню, бязлітасна знішчаць ворагаў. Мы будзем берагчы нашага правадыра і яго саратнікаў.

Няхай доўгія гады жыве наш родны **Сталін!**

Ордэнаноска Ада Кісялёва.

Менск, фабрыка „Окцябр".

ВОЛЯ НАРОДА ВЫКАНАНА

Глыбокую нянавісць і гнеў выклікала ў кожным з нас подлая банда фашысцка-зіноўеўскіх забойц. Гэта фашысцкае атрэп'е імкнулася вярнуць нам капіталістычную эксплаатацыю шляхам тэрора супроць нашых любімых правадыроў, супроць нашага роднага Сталіна, які як сонца грэе сэрцы працоўных вялікага совецкага Саюза.

Але гэтыя подлыя сабакі дрэнна разлічылі свае дзеянні. Пільныя вартавыя совецкіх межаў, верныя сыны нашай радзімы—слаўныя чэкісты злавілі гэтых гадаў. Справядлівы пролетарскі суд сурова пакараў гэтую банду галаварэзаў, прыгаварыўшы іх да вышэйшай меры пакарання—расстрэлу.

Воля народа выканана. Калі па радыё перадалі аб выкананні прыгавора, я з адчуваннем вялікай радасці сказала: вялікае дзякуй нашаму справядліваму суду, слаўным чэкістам і генеральнаму камісару дзяржаўнай безапаснасці таў. Ягодзе, што знішчылі гэтую гнойную больку са здаровага цела нашай радзімы.

Я—стаханаўка, былая батрачка. Мне давялося на сабе адчуваць увесь цяжар кулацкай эксплаатацыі. Комуністычная партыя і любімы Сталін далі нам шчаслівае і радаснае жыццё.

Ужо некалькі год я з'яўляюся членам горсовета. Я прынята ў спачуваючыя вялікай партыі ВКП(б). Гэта мяне абавязвае яшчэ больш узняць большэвіцкую пільнасць і дапамагчы партыі выкрыць усе застаўшыеся карэнні тройчы прэзрэнных двурушнікаў з трацкісцка-зіноўеўскай банды.

Што можа быць у свеце даражэй за жыццё нашага любімага і роднага Сталіна і яго лепшых паплечнікаў?

Нічога ў свеце!

Такі адказ дае народ вялікай радзімы, які ўсім сваім жыццём адданы сваім палкаводцам рэволюцыі, свайму роднаму **Сталіну.**

Хвашчэўская.

Менск,
Завод „Большэвік".

Мы ўсе згуртаваны адзінаю воляй,
Адзіным пачуццем, жаданнем адным.
Не верне былога ніхто і ніколі,
У прах яно пала і знікла, як дым.

(З пісьма беларускага народа вялікаму СТАЛІНУ).

СТАЛІНА МЫ БЕРАЖЭМ ЯК ЗЯНІЦУ ВОКА

Палёты сёння былі закончаны, але многа людзей у сініх камбінезонах засталося ў ангары. Тут праводзіцца чыстка машын. Нібы мураўі абсыпалі вучлёты машыны. Кожная група чысціць сваю машыну. Кожны мае свой участак, за чыстату якога ён адказвае. „Машына павінна блішчэць“,—гэта ўказанне інструктароў усе добра памятаюць.

Вось на самым версе самалёта Ніна **Тачыліна**. З пад акуратна апранутага шлема бачны некалькі пасмаў кучаравых валасоў.

Ніна—старшыня лётнай групы і нясе адказнасць за становішча матэрыяльнай часткі. Яна—добры прыклад для астатніх і не дарма карыстаецца вялікім аўтарытэтам.

Пабольш-бы такіх, як Ніна! Сёння яна зрабіла 28 самастойны палёт. Яна ўжо скончыла другое практыкаванне VI задачы і збіраецца выляцець у зону.

У запісной кніжцы начальніка лётнай часткі Аэраклуба—капітана Пімкіна—супроць яе прозвішча заўжды значыцца „добра“ і „вельмі добра“.

Яшчэ ў ангары засталіся людзі, але каля машыны „4“ нікога няма. Група пастроілася і пайшла па вядомай ёй сцежцы, якая вядзе да палатак лагера. З палатак няслася песня:

Я другой такой страны
не знаю,
Где так вольно дышет
человек...

Рэбята мыюцца, прыводзяць сябе ў парадак. Ніна прышла пазней. Яна яшчэ збегала на старт за звесткамі аб сённешнім палёце.

Цягу да лётнай справы Ніна адчула даўно. Калі яна вучылася ў школе, яна любіла апавяданні аб гераічных лётчыках.

Ніна з радасцю ўспамінае той вечар, калі адбыўся выпуск у школе.

Дырэктар запытваў у многіх аб далейшых перспектывах. Падыйшла чарга і да Ніны:

— А ведаеце, тав. дырэктар, я-б хацела стаць лётчыкам,— заявіла дзяўчынка.

Дырэктар паціскаў плячыма. Яму дзіўна было, каб дзяўчына хацела быць лётчыкам.

І Ніна ператварае ў жыццё свае мары.

— Пасля сканчэння лётнай школы думаю вучыцца далей у ваеннай школе. Хачу ўліцца ў лік гордых сокалаў нашай краіны, на якіх з радасцю глядзяць працоўныя ўсяго свету! А ворагі нашы за мяжой і рэшткі трацкісцка-зіноўеўскай зграі—няхай ведаюць, што мы недамо ім дакрануць нашых кіраўнікоў, што таварыша Сталіна мы беражэм як зяніцу вока,—з запалам гаворыць Ніна.

Клебанаў.

Гомель.



Парашутыстка — інструктар менскага аэраклуба НІНА КАЛІТА і ўчлет МАРУСЯ ЦІРЛІКЕВІЧ (злева направа)
Белсаюзфото.

ЗА ВЯЛІКАГА СТАЛІНА—ЖЫЦЦЁ АДДАДЗІМ

Я пісала ўжо ў журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“ аб сваёй рабоце і аб тым, што на злёце перадавікоў па ўраджайнасці ўзяла абавязацельства дабіцца рэкорднага ўраджаю ўсіх культур. На гэтым злёце маё звяно назвалася звяном вядомай ордэнаноскі Марыі Дэмчанка. Па прыездзе ў калгас, мы ўзяліся за глыбокае вывучэнне агратэхправіл. У выніку гэтага мы маем цяпер добры ўраджай усіх культур.

Бульба — скараспелка мела па 25—30 штук вялікіх бульбін пад кожным карчом. З аднаго гектара мы сабралі 425—450 цэнтнераў. Яравой пшаніцы і аўсу мелі па 26 цэнтнераў з гектара. Буракі яшчэ не здымалі, але свае абавязацельствы спадзяемся выканаць. Лён здадзім 26 і 30 нумарамі.

Як-жа мы дабіліся такога ўраджаю? Перш за ўсё дапамагло нам тое, што набытыя агратэхнічныя веды мы прыстасоўвалі на ўсіх работах. Усю плошчу пасеваў пакрылі тоўстым пластом гною. Дабавілі яшчэ каля 75 тон попелу, 2 цэнтнеры калійнай солі і 1 цэнтнер калчадана. Перад пасевам бульбу адбіралі адна ў адну. Зусім маленькую не садзілі. Кожны корч паасобку старанна абкапвалі па некалькі разоў.

Мяне многія калгаснікі хацелі ўпэўніць, што такі догляд за агароднінай надзвычай марудны. Але я не слухала нікога, бо была ўпэўнена ў сваіх сілах і мела некаторы вопыт.

Мудрыя словы нашага роднага **Сталіна** аб тым, што трэба працаваць так, каб усе калгасы сталі большэвіцкімі, а ўсе калгаснікі заможнымі,—ператвараюцца ў жыццё. Кожны дзень, шпаркімі крокамі расце гэтая заможнасць нашага калгасу і калгаснікаў. Той, хто працаваў і працуе сумленна, увосень атрымае на працадзень у два разы больш, чым у мінулым годзе.

Зараз уся наша краіна ахоплена гневам абурэння супроць подлай дзейнасці трацкісцка-зіноўеўскай бандыфашысцкіх агентаў і тэрарыстаў.

Я не магу знайсці слоў, каб выказаць сваю нянавісць да гэтых тройчы прэзрэнных фашысцкіх выродкаў,якія асмеліліся падняць крывавую руку на лепшых сыноў рэвалюцыі, на нашага роднага Сталіна.

Усе працоўныя выказваюць сваю бязмежную любоў да любімага Сталіна, які даў нам—былым батракам — шчаслівае і радаснае жыццё. За гэта мы заўсёды гатовы аддаць сваё жыццё да апошняй кроплі крыві.

Няма і не можа быць літасці да фашысцкіх выродкаў, крывавых забойцаў, — такая думка ўсіх працоўных Совецкага Саюза. І гэта ўлічыў наш справядлівы пролетарскі суд. Ворагі народа знішчаны. Так будзе зроблена з кожным, хто асмеліцца пасягнуць на наша шчаслівае жыццё, на нашага вялікага **Сталіна**!

Вера Саковіч.

Калгас „Чырвоны бераг“, Аршанскага раёна.

РАДЗІМА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ — КРАІНА СОВЕТАЎ

Я—немка і я шчаслива, што жыву ў Совецкім Саюзе, а не ў фашысцкай Германіі, якая дапамагала трацкісцка - зіноўеўскай сволачы падняць руку на нашага любімага Сталіна і на бліжэйшых яго паплечнікаў.

Але рукі кароткі! Наша родная Чырвоная армія, нашы слаўныя чэкісты і ўвесь наш гераічны совецкі народ як зяніцу вока абараняюць любімага Сталіна, партыю і ўрад ад усякіх ворагаў—замежных і ўнутраных.

Я не стаханаўка, я—ударніца. Люблю сваю работу і фабрыку. Выконваю план заўсёды больш, як на 100 проц. Але частыя пераходы з аднаго працэса на другі не даюць мне магчымасці стаць стаханаўкай.

Сама я нядаўна на фабрыцы. Калі я была хатняй гаспадыняй, я мела вялікае жаданне працаваць на вытворчасці. І паўгода таму назад я прышла на фабрыку „8 сакавіка“. Акуратна наведвала я тэхвучобу. Здала тэхэкзамен на „добра“.

Пасля адпачынку наша фабрыка перайшла на выпуск новых фасонаў. У гэты час ад усіх работніц патрабуюцца надзвычай уважлівыя адносіны да працы, ад гэтага залежыць паспяховае выкананне плана. Я працую на аддзелцы шарсцяных сукенак. Стараюся выконваць сваю работу дасканала і акуратна.

Маю траіх дзяцей, якія выхоўваюцца ў дзіцячым садзе, вучацца ў школе. Ды і сама я вучуся ў гуртку малапісьменных, дзе вывучаю беларускую мову. Хутка буду самастойна чытаць газеты і мастацкую літаратуру.

З вялікай увагай чытала я праект Сталінскай Канстытуцыі. Кожнае слова гэтага гістарычнага дакумента глыбока ўвайшло ў маю свядомасць.

Сталінская Канстытуцыя, Канстытуцыя шчаслівых людзей шчаслівай краіны, прадугледжвае для нас і нашых дзяцей яшчэ лепшае і шчаслівае жыццё. І за гэта мы вельмі ўдзячны нашаму вялікаму і роднаму Сталіну, і за гэта мы гатовы аддаць, калі патрабуецца, усе свае сілы на абарону сваёй социялістычнай радзімы.

Менск. **Крысціна Пуль.**

АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ, ПАРТЫЮ, ПРАВАДЫРА

Марголі Рубінштэйн 46 год, але ў грамадскай рабоце яна не адстае ад моладзі. 7 год працуе яна членам Парыцкага местсовета. Яна дабілася датэрміновага выканання плана па малаку, па мясу і па грашовых плацяжах. Добра ведае рашэнні партыі і ўрада ў гэтай галіне і асабістым прыкладам вучыць астатніх актывістак, як трэба змагацца за выкананне гэтых дырэктыў.

Тав. Рубінштэйн цікавіцца і абарончай работай. Яна першая па свайму ўчастку сабрала сродкі на пабудову эскадрыллі самалётаў, на 100% рэалізавала білеты Х латарэі АСО і дапамагла вывесціншыя ўчасткі з прарыва па рэалізацыі гэтых-жа білетаў.

— Абарончая работа—гэта вялікая справа, — кажа тав. Рубінштэйн.— Нам неабходна абараняць нашу радзіму, нашу партыю, нашага правадыра таварыша Сталіна. Усе нашы ворагі павінны ведаць, што не толькі Чырвоная армія, але ўвесь совецкі народ гатоў аддаць усе свае сілы на абарону нашай партыі і ўраду ад усіх ворагаў, якую-б маску яны не надзявалі.

М. Ракавіцкая.

Парыцкі раён.

На ўсіх прадпрыемствах горада Менска адбыліся мітынгі, прысвечаныя абмеркаванню абвінаваўчага заключэння па справе трацкісцка-зіноўеўскага цэнтру. НА ЗДЫМКУ: двухтысячная маса рабочых і работніц фабрыкі „Кастрычнік“ на мітынгу. (Фота Я. Салавейчыка).

СЛОВЫ ОРДЭНАНОСКІ

На чорным фоне наступаючай начы рэзка вылучаліся электрычныя лямпачкі, якія рассыпаліся зоркамі па хатах. Лёгкі ветрык павольна гайдаў высокія дрэвы. Адчувалася хуткае набліжэнне дажджу. То там, то тут памінутна ўспыхвала загадкавым бляскам маланка і асвятляла людскія постаці, якія рупліва прабіраліся да праўлення калгаса.

Кожны вечар сюды збіраліся калгаснікі вырашаць свае справы. Паміж старыкоў, якія сядзелі недалёка ад прэзідыума, ішла ажыўленая гутарка.

— Эх, і лянок у нас,—пачаў гутарку дзед Архіп Сідарэнка, трымаючы ў зубах люльку.

— Мы ў гэтым годзе маем сапраўды добры лянок,—адгукнулася Марфа Іванаўна, жонка дзеда Архіпа.

Яна працуе ў звяне ордэнаноскі Праскоўі Ціханскай. Марфа хаця і старая, але працуе спрытна.

Праз некаторы час званок спыніў шум у пакоі. Старшыня калгасу паведаміў рашэнні пленума ЦК КП(б)Б аб расцілу і сцерабленні ільну. Першай папрасіла слова тав. Ціханская.

— У мінулым годзе, — пачала яна,—за лён з нашага калгаса два чалавекі атрымалі вышэйшую ўзнагароду—т. Ражкоў—ордэн Леніна, а я—ордэн „Знак Почета“. Тады мы далі абяцанне таварышу Сталіну—даць дзяржаве з гектара не менш 6 цэнтнераў ільнавалакна высокага гатунку. І мы гэта з гонарам выканаем!

— Правільна! — падтрымалі ўсе прысутныя.

І сапраўды, у яе звяне праца ідзе паспяхова. Сцерабленне ільну прайшло хутка і без страт. 11,5 гектараў лёну намочана і расцелена. За ільном на сцелішчы наладжан пільны догляд. За гэта адказвае сама Ціханская. Яна амаль кожны дзень бывае на сцелішчы, бярэ пробы. Як маці даглядае і выхоўвае сваё дзіця, так Праскоўя Канстанцінаўна даглядае свой лён.

Некалькі дзён таму назад яна ўжо здала першыя 52 кілограмы ільнавалакна, здала пакуль 18 нумарам. А лепшы лён яшчэ не вылежаўся. Той абавязкова будзе 24—26 нумарам.

Для лепшай і паспяховай апрацоўкі пабудавана бяздымная сушылка, устаноўлены дзве мяльныя машыны „Антонава“. Адна з іх, дванаццацівальная, працуе матарам. На трапальнай машыне калгасніцы перавыконваюць нормы больш чым у два разы.

— У гэтым годзе мы мяркуем здаць дзяржаве ільнавалакно не ніжэй як 26 нумарам,—заяўляе тав. Ціханская.

— І мы здамо,—дружна адказалі ёй дзяўчаты.

Ноч паступова ўваходзіла ў свае правы. Памяшканне хутка апусцела, але трое яшчэ доўга раіліся, як лепш наладзіць апрацоўку лёну—гэта былі старшыня калгаса і ордэнаносцы Ціханская і Ражкоў.

А потым Праскоўя Канстанцінаўна накіравалася ў гумно. Пад рытмічны ляск церабільнай і мяльнай машын чуцен спеў дзяўчат.

— Дзяўчаткі,—спыніла іх Праскоўя Канстанцінаўна—заўтра мы павінны паказаць сваю работу!

— Усё будзе ў парадку,—адказалі дзяўчаты і зноў узяліся за работу.

Праскоўя Канстанцінаўна ўпэўнена, што дзяўчаты не падвядуць. Усе цяжкасці і непаладкі будуць пераможаны, а слова, дадзенае любімаму Сталіну, будзе з гонарам выканана. Лён будзе здадзен не ніжэй 26 нумара!

— Гістарычны дакумент—Сталінская Канстытуцыя—стварае для ўсіх працоўных вялікага Совецкага Саюза яшчэ больш заможнае жыццё. А подлым фашысцкім выродкам з банды трацкістаў і зіноўеўцаў паспехі социялістычнага будаўніцтва не спадабаліся. Яны пазладзейску, з-за вугла імкнуліся забіць нашых любімых кіраўнікоў. Але гэтых тройчы прэзрэнных агальцелых выродкаў пролетарскі суд прыгаварыў да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Паўзучай гадзіне не ўдаўся і ніколі не ўдасца замах на нашага роднага Сталіна і яго паплечнікаў, жыццё якіх працоўныя Совецкага Саюза абараняюць і будуць абараняць, як зяніцу вока!—з запалам заявіла Ціханская.

Лагунова.

Аршанскі раён — калгас „Чырвоныя Яромкавічы“.

26

У нумары 10 журнала мы пісалі аб першым этапе барацьбы за лён звеннявой Лапенко Ульяны з калгаса імя Сталіна, Полацкага раёна.

З энтузіязмам і энергіяй правяла яна ўсю падрыхтоўчую работу і самую сяўбу. Зараз мы раскажам, як Лапенко даглядала лён і праводзіла далейшую яго апрацоўку.

***

Па 5—10 сантыметраў за суткі расце лён.

— Небывалы будзе ўраджай з гэтага ўчастка,—казалі калгаснікі.

Дык як не быць яму небываламу — сталінскаму ўраджаю? Звяно працавала па-стаханаўску. Чатыры разы палолі, з увагай і настойлівасцю вялі барацьбу з пустазеллем.

Але раптам на пасевах з'явіўся шкоднік—ільняная блыха. Звяно арганізавала паліўку, блыха згінула.

Калі лён дасягнуў 35 сантыметраў, на яго наклалі сетку, каб не дапусціць палягання. Праз дзень пайшоў дождж.

— На ўчастак прышоў я праз суткі пасля дажджу. Гляджу,— сеткі няма. Заныла сэрца, памутнела ў вачох. Нічога не бачу. Во, думаю, ужо рука ворага падкралася, знішчыла сетку! Але праходжу далей і неверу сваім вачам: сетка стаіць. Лён за суткі вырас на 11 сантыметраў і ў густым ільну схавалася сетка,— расказвае брыгадзір Глазкін.

Расправіліся з пустазеллем, блыхой, а вось тут і новая бяда. Ад спякоты зямля стала ссыхацца і лопацца. Сонца бязлітасна паліла.

Узялося звяно за стварэнне штучнага дажджу. Прыкацілі на ўчастак пажарную бочку і вечарам буйнымі кроплямі пайшоў „дождж". Кожны вечар паліваліўчастак.

Лён на ўчастку Лапенка рос 75 дзён. Сцябло дасягнула 1 метра 20 сантыметраў. Сонца пякло, а на ўчастку поўна было вільгаці.

***

Вось і поле. 7 жанчын заняты цераблением. Тут-жа адразу пасля цераблення, ачосваюць галоўкі на спецыяльных жалезных грэбенях.

Услед за ачосам саломку вяжуць у снапкі (па 10 жмень у кожны) і замачваюць.

Лён мачыўся 8—9 дзён, а пасля гэтага саломку вымалі з мачыльных ям і расцілалі для вылежкі, якая таксама працягвалася 10 дзён.

29 ліпеня ўвесь лён быў ужо замочан, а першая партыя разаслана для вылежкі. 9 жніўня пасля мочкі быў разасланы апошні лён. 10 жніўня была загружана ў сушню першая партыя ў 80 кулькоў ільну. Для сушкі ільну падрыхтавалі сухія альховыя і бярозавыя дровы.

Сушка трасты працягвалася 16 гадзін. Для мяцця ўстанавілі конную мялку.

Калгасніцы звяна цвёрда ведалі сваё месца ў рабоце. Сушаную трасту для падачы ў мялку падсартоўвалі Надзя Луферава і Александрына Лапенка. Яны раўнялі трасту і роўнамернымі жменькамі складалі на лаўку. У мялку першы дзень трасту падаваў Мікола Глазкін.

Жменя паміж вальцаў прапускалася 4—5 разоў і выходзіла амаль зусім чыстае валакно. Адыходаў з пад мялкі было зусім мала.

Ульяна Лапенка, Быхавец, К. Глазніна, Т. Глазніна і Г. Быхавец змятыя жмені трасты тутжа раўнялі, абцягвалі і злёгку вытропвалі кастрыцу.

Апрацаваная начорна траста тут-жа складвалася ў асобнае месца для адлежкі. Трапалі валакно на машыне „Санталава".

11 жніўня звяно для пробы трапала валакно ўручную. З 1800 сцяблоў (у сярэднім на квадратны метр было 2000) натрапалі 104 грама валакна.

13 жніўня на Полацкі пункт „Заготлён" паступіла першае валакно ў колькасці 39,5 кілограм для пробы. Гэта было валакно звяна Лапенкі. Яно было прынята 22 нумарам.

— Гэты лён пры правільнай апрацоўцы і адлежцы можа быць прынят 26 нумарам,—сказаў прыёмшчык.

Здаўшы усё валакно 26 нумарам калгас атрымае 20 тысяч рублёў.

***

Полацкі райком партыі нядаўна атрымаў такую заяву:

„Я сваёй работай даказала адданасць партыі. Мяне лічаць беспартыйным большэвіком, але я хочу яшчэ больш прыблізіцца да партыі.

Ульяна Лапенко".

Райком партыі прыняў Лапенко ў групу спачуваючых.

І ў гэтую пару, калі змецены з твару зямлі агідныя бандыты з трацкісцка-зіноўеўскай зграі, пасмеўшай замахнуцца на вялікага Сталіна, Ульяна яшчэ больш адчувае сябе дачкой вялікага совецкага народа, які з любоўю і павагай згуртоўваецца вакол ленінска-сталінскай партыі, вакол правадыра працоўных усяго свету—мудрага Сталіна. **Малевіч.**

Варашылаўскія стралкі. На першым плане арганізатар гуртка ордэнаноска т. Керымава (Азербайджан)
Саюзфото.

КОК-САГЫЗ

Над праблемай здабывання натуральнага каучука ў нас, у Совецкім Саюзе, праведзена настойлівая работа. І работа гэта ўвянчалася поўным поспехам.

Сем год назад знойдзена дзікарастучая расліна кок-сагыз, карэнні якой у сухапаветраным выглядзе трымаюць 40 проц. натуральнага каучука.

Кок сагыз быў знойдзен у паўднёва-усходніх мясцах Совецкага Саюза. Але ў Беларусі ў дзікім выглядзе расце яго родзіч—з адной сям'і раслін—звычайны адуванчык. Адгэтуль нарадзілася думка, што кок-сагыз можа расці і ў нас.

І вось увесну 1936 года ў калгасах Смалявіцкага раёна ўпершыню пасеялі кок-сагыз на плошчы ў 6,5 гектараў.

У калгасе „Пяцігодка" пасеялі толькі 1 гектар. Паасобныя калгаснікі сустрэлі непрыхільна новую расліну. Узяліся за кок-сагыз лепшыя жанчыны калгасу. Гэта былі Яхіма Папковіч, Елізавета Якубіцкая, Марыя Сіліч, Юлія Сіліч, Зося і Уліта Піліповіч.

На балотах, землях, якія ніколі не засяваліся, пасеялі новую расліну. Уважліва, з мацярынскай любоўю да свайго первенца хадзілі жанчыны за кок-сагызам, прапалвалі, рыхлілі глебу самазробленым прапольшчыкам. І вынікі ўжо далі сябе адчуваць.

Па соцспаборніцтву, якое заключана паміж калгасамі БССР і маскоўскай вобласці, у першы год засева кок-сагыза лепшыя паказальнікі—сабраць 3 кілограма гэтага каштоўнейшага насення з гектара.

У нашай „Пяцігодцы" з гектара ў ліпені сабралі 12 кілограм, а жнівень і верасень дадуць плоданашэння яшчэ больш, чым папярэднія месяцы. І ўсё гэта дзякуючы добрасумленнай працы калгасніц, якія палюбілі гэту новую расліну.

Дзеці значна дапамагаюць жанчынам у рабоце. Час жніва—гэта пачатак сезона збору насення. І калі жанчыны пайшлі жаць, на збор насення выйшлі іх дзеці—школьнікі. Тут былі Ліда Піліповіч, Оля і Ліда Якубіцкія, Ліпа, Шура і Надзя Папковічы. Дзетвара не толькі добрасумленна збірала насенне, але пры дапамозе агранома таварыша Філіна знайшла шкодніка шчыгла, які паядаў насенне.

Дзетвара зрабіла чучалы, ганяла птушак з плантацыі.

— Цяпер у нашай краіне з кожным месяцам будзе ўсё больш і больш каучука,—упэўнена кажа Яхіма Папковіч.—Будзе ў нас болей і шын к аўтамабілям, і болей галош. Нам цяпер усяго патрэбна больш: машын—для ўмацавання нашай народнай гаспадаркі, а галош—каб свой абутак не пэцкаць у гразь,—з усмешкай дадае яна.

Гэтую думку ўклалі калгасніцы і ў частушкі, што распяваюць у калгасе:

Я пасею кок-сагыз,
Вырасце харошы,
А мой мілы на заводзе
Зробіць мне галошы!
Прапалю я кок-сагыз,
Будзе з яго шына,
А мой мілы да мяне
Прыедзе на машыне!
Я з гектара сабяру
Кок-сагыза тону,
Прэміроўку палучу,
Падару й мілому!

М. Жук.

Праполка кок-сагыза ў калгасе „Пяцігодка", Смалявіцкага раёна.

Да навучальнага году

Дырэктар пятай школы імя Дабралюбава тав. Станкевіч заклапочан. Будаўнічая кантора не выконвае свайго абавязацельства і адмаўляецца ў свой час закончыць рамонт памяшкання. Дырэктар па два і па тры разы на дзень прыходзіць у школу, уваходзіць у ва ўсе дробязі рамонту і падганяе прараба.

Хіба можа школа, якая выйшла ўвесну на першае месца, сарваць пачатак навучальнага года? Гэтага дапусціць нельга! Але што рабіць?

У такую няўдалую хвіліну да дырэктара ў канцылярыю прышлі дзве маладыя жанчыны.

— Мы да вас ад вашага шэфа — завода „Большэвік",—праказала зграбная жанчына з ветлівым тварам.—Мы былі на нарадзе ў ЦК КП(б)Б. Там жоны ІТР будаўнічага ўчастка расказалі аб тым, як яны арганізавалі дапамогу школам у падрыхтоўцы да новага навучальнага году. Мы таксама ўзялі на сябе абавязацельства дапамагчы школе.

— Вось гэта добра,—заўважыў дырэктар.

— Мяне вы ведаеце, як маці Юліка Іоффе, але зараз я з'явілася да вас, як старшыня совета жон ІТР Белскуртрэста, а гэта,— паказала яна на спадарожніцу,— жонка інжынера завода „Большэвік', Марына Ізраілеўна Орэшкова.

— Вас я дзесьці сустракаў,— павярнуўся дырэктар да Марыны.

— Вы выкладалі геаграфію ў той школе, дзе я вучылася,— адгукнулася яна, і румянец зацягнуў яе шчокі.

Дзейныя жанчыны абышлі ўсё памяшканне. Высветлілася, што работу тармозіць адсутнасць цвікоў і нястача бяліл. Тут-жа дамовіліся, што Газалія Александраўна і Марына Ізраілеўна бяруць на сябе клопаты аб гэтым. Апроч таго рашылі, што ўвесь рамонт павінен быць закончан да 25 жніўня. Да гэтага часу ўсё памяшканне павінна быць поўнасцю адрамантавана, двор ачышчан ад будаўнічага смецця і падрыхтаваны да азялянення.

— Я лічу, як толькі школа прыступіць да заняткаў, нам неабходна будзе склікаць жонак выкладчыкаў і мацерэй актывістак,—праказала Марына, запытальна паглядваючы на спадарожніцу.

Тая вокамгненна злавіла яе думку.

— Гэта для таго, каб пры школе арганізаваць советы жон як на вытворчасці?

— Так, я думаю.

— Гэта не дрэнная ідэя і мы здолеем яе ажыццявіць,—падтрымаў дырэктар.

— Але мы на гэтым не спынімся. Хочам арганізаваць буфет,—усміхнулася Разалія Александраўна.

— Магу толькі вітаць ваша жаданне! Чым здолею—дапамагу.

— Потым мы рашылі, што ў дзень адкрыцця школа павінна мець святочны выгляд. Трэба прыбраць будынак звонку партрэтамі правадыроў, плакатамі і лампкамі.

І праз гадзіну, пасля ажыўленай, цёплай гутаркі наведвальніцы пайшлі, пакінуўшы дырэктара ў больш радасным настроі.

Узбуджаная ішла Марына. Яна спяшалася дамоў, хутка муж прыдзе абедаць.

—Заўтра-ж трэба арганізаваць дастаўку цвікоў у школу. З гэтым трэба асабліва спяшацца.

Прыгожы твар маладой жанчыны расчырванеўся ад хадзьбы. Думкі Марыны Ізраілеўны несліся далей.

Калі дзверы інстытута, дзе яна вучылася, закрыліся на час летняга перапынку, Марына не засталася без справы. Совецкая школа, за тым Вышэйшы педагагічны інстытут, факультэт замежных моў, прызвычаілі маладую жанчыну напаўняць свой дзень да краёў.

Як раз у пачатку канікул на сходзе жон ІТР яе, Наточыну, Бекман і Капялевіч выбралі ў совет. Марына была абрана старшынёю совета.

Тут-жа яна арганізавала для рабочых гурток англійскай мовы, у якім сама і выкладала. Рабочыя ахвотна наведвалі заняткі, і гэта радавала яе.

Як старшыня совета жонак ІТР, Марына ўваходзіла ва ўсё жыццё заводу. Дрэнна працавала сталовая,—яна ішла туды з членам совета Бекман. Яны выяўлялі прычыны і ліквідоўвалі іх.

На заводзе ёсць надзвычай добры дзіцячы сад і яслі. Неабходна было сачыць за іх работай, і жоны ІТР гэтым заняліся.

Дзякуючы таму, што паўсядзённае жыццё завода ўцягнула яе ў сваё рэчышча, у маладой жанчыны з'явіліся агульныя з мужам інтарэсы, якія яшчэ шчыльней зблізілі іх, зрабілі мацнейшай іх любоў і дружбу.

Думкі Марыны віхурыліся, а абцасікі яе дробна стучэлі па асфальту тратуара.

Так. Усяго два месяцы працуюць яны з Разаліяй Александраўнай, з гэтай хрупкай на вока, але дзейнай і энергічнай жанчынай. Два месяцы, а зроблена ўжо шмат.

Цудоўны чалавек гэта Разалія Александраўна! Калі школа паслала рэбят у піонерскія лагеры, Разалія Александраўна, азнаёміўшыся з недахопамі лагера, звярнулася да шэфа школы. Расказала дырэктару завода „Большэвік" таварышу Бандарчыку, у чым маюць патрэбу дзеці, і прасіла дапамагчы. Дырэктар адгукнуўся на гэту справу.

У лагер быў паслан фізкультурнік, які запоўніў дзіцячы досуг разумнымі гульнямі. Арганізоўваліся шахматныя турніры, футбольныя спаборніцтвы, рэбяты пускалі паветраны шар. У лагер была паслана кінопересоўка. Жыццё дзяцей стала цікавейшым, поўным.

Разалія Александраўна паспявае ўсюды. Яна працуе ў Скур-

снабзбыце, яна і старшыня совета жон ІТР Белскуртрэста. Тут яна паказала сябе асабліва энергічным, карысным чалавекам. Яна ахоплівае 14 прадпрыемстваў, уваходзіць ва ўсе дробязі жыцця рабочых.

Марына паднялася на другі паверх і ўвайшла ва ўтульную чыстую кватэру. Хутка чатыры гадзіны,—папракнула яна сябе і ўзялася гаспадарыць, падпяваючы бадзёрым гукам марша з оперы „Кармэн", якія ліліся з рэпрадуктара.

* * *

Праз некалькі дзён абедзве актывісткі зноў наведалі школу. Рамонт хутка зрушыўся наперад. Дырэктар узрадваўся іх прыходу.

— Вось цяпер мы добра сустрэнем дзяцей! Смецце з двара ўжо вывозім.

— А як у вас з інвентаром?— запыталася Разалія Александраўна.

— Не дрэнна! Вы бачылі, якія прыгожыя новыя парты мы паставілі ў класах?

— Палюбаваліся ўжо. Цяпер пра буфет...

— І пра вонкавае афармленне,— дадала Марына.—У вас ёсць чырвоны матэрыял для плакатаў?

Дырэктар усміхнуўся.

— Ну, вядома ёсць!

— Што яшчэ вам трэба для заканчэння рамонту?—запыталася Марына.

— Вось, калі-б вы дапамаглі дастаць хаця 8 кіло бяліл, дык мы-б асвяжылі ўсе дзверы.

— Крыху бяліл у мяне ёсць, дабуду яшчэ,—сказала Разалія Александраўна і хутка развіталася.

Яны вышлі на залітую сонцам вуліцу.

— Усё-ткі ў мяне яшчэ мала навыку ў гэтай нашай рабоце. У навучальных установах іншыя формы грамадскай работы. Нарада ў ЦК мне дала шмат чаго,— праказала Марына, спыняючыся і закідваючы русую галоўку, каб лепш агледзіць фасад школы.

— Зразумела, такія нарады прыносяць вялікую карысць.

— Я прызнаюся вам па сакрэту, Разалія Александраўна, калі мы сёння ўручалі наш акт дырэктару завода, я трусіла.

— Чаму? — здзіўлена ўзняла бровы яе субяседніца.

— У нас там восем пунктаў, думала, ён адмовіцца праводзіць у жыццё нашы прапановы.

— Ну, і дарэмна трусілі! Усё, што мы адзначылі ў акце, неабходна. Хіба можна пакінуць не адрамантаванай страху хромавага цэха, або не перанесці з сарая жаночую раздзявалку? Усё гэта неабходна, як і астатнія пункты. І дырэктар улічыў гэта.

— Вось і са школай ідзе ўсё добра. Я вельмі рада, што яна ў поўнай гатоўнасці спаткае навучальны год.

— Значыць, на днях будзем прыбіраць яе.

— Абавязкова! Заўтра складзем план, выбярэм лозунгі для плакатаў і зробім усё так, каб дзецям было радасна і добра.

— Ведаеце, Марыначка, зараз мы, бацькі, прад'яўляем да школы вялікія патрабаванні. Школа павінна нам дапамагчы выхаваць у нашых дзецях лютую нянавісць да гнусных, подлых здраднікаў, забіўшых Сергея Міронавіча Кірава і пасмеўшых рабіць замах нават на нашага **Сталіна**.

Менск. **Ан. Алмацінская.**



Заняткі па фізіцы ў 6-ай Менскай польскай школе. (Белсаюзфото)

Андрэй Ушакоў.

Вярнуўся

(Апавяданне)

Павел Нежданаў нясмела прайшоў праз пусты і цёмны калідор да крайняга пакою. На дзверах вісеў замок. Нежданаў пераступіў з нагі на нагу і гучна кашлянуў. На яго моцны стук адчыніліся дзверы суседняй кватэры і высунулася ўскалмачаная галава жанчыны.

— Ці-ж вы не бачыце, што замок вісіць,— захутваючыся ў шырокі халат і выходзячы ў калідор, ухмыльнулася жанчына.

— А я і не заўважыў...,—вінаватым тонам адказаў Нежданаў.—Чацверты раз заходжу і ніяк не магу заспець дома. Грошы трэба перадаць...

Апошнія словы ён прамовіў падкрэслена.

— Клапоціцеся ўсё-ж такі,—падступіла бліжэй жанчына.

— Ну а як-жа? Абавязак—адказаў Павел.

— Зося трэці дзень у больніцы і прасіла вас зайсці... Ведаеце, дзе больніца?

І не чакаючы адказу, пачала тлумачыць:

— Гэта як ідзеш на рынак па вуліцы...

— Ды я ведаю, ведаю,—перапыніў яе Нежданаў.

Відаць, гутарка на гэтую тэму для яго была непрыемнай.

— Бывайце здаровенькі!—сказаў ён. ужо крочачы па калідору.

За гадзіну перад гэтым з Нежданавым здарыўся выпадак, які моцна занепакоіў яго. У інстытуце ён прывітаўся з ішоўшымі знаёмымі дзяўчатамі. Тыя прайшлі міма яго, робячы выгляд, што не заўважаюць. Ды і комсорг, убачыўшы яго, запытаўся:

— Ну, як, грошы Зосі аднёс?

— У-у, яшчэ ўчора!—схлусіў Нежданаў.

Цяпер неабходна было тэрмінова адшукаць яе і аддаць грошы, інакай выкрыюць ягоману. Толькі як іх перадаць? У больніцы запытаюцца: „ад каго? Адказаць: „ад мужа"? Як непрыемна гучыць слова „муж"! Схлусіць:—брат? Яшчэ павядуць у палату. Пачнуць паказваць дзяцёнка, будуць віншаваць... А можа Зося і глядзець не захоча на яго, пры людзях прагоніць. Сораму не абярэшся. Хіба грошы ў пакетцы перадаць, а самому хуценька уйсці? Не: Гэтак яны могуць згубіцца, Зося-ж яшчэ слабая здароўем... І тут прыходзіць у галаву звярыная думка: А можа дзіцёнак пры родах памрэ? Бываюць-жа такія выпадкі...

З дому ён вышаў шпаркімі крокамі, але чым бліжэй падыходзіў да рынка, тым рухі яго рабіліся больш павольнымі. Нарэшце ён спыніўся зусім. Вось і рынак, і вуліца, на якой змяшчаецца больніца. „А жанчына-ж не сказала нумару дома. Нават назву вуліцы не сказала",—мільганула ў галаве думка. Можа больніца зусім у іншым баку... Ну, канешне,—пачаў ён запэўняць самаго сябе, хоць добра ведаў, што больніца менавіта на гэтай вуліцы, тут ён не раз праходзіў і бачыў яе. Гэта быў самаабман. Гульня ў хаванкі са сваім сумленнем. Нежданаў адчуў, што яму сорамна будзе цяпер сустрэцца з Зосяй. Ён нічога не зможа сказаць ёй у сваё апраўданне. А маўчаць, ці перазважна ўхмыляцца—цяжка і ніякавата. І ён збочыў на другую вуліцу і пайшоў па ёй, пільна ўглядаючыся ў шыльды, усё больш набаўляючы крок.

* * *

Зося сядзела на ложку. Цела млела ад слабасці, хіліла на сон. Побач у каляскі спала дзіцё. Ад Зосі толькі што вышлі сяброўкі, яе аднакурсніцы па інстытуту. Яны прынеслі падарункі: кветкі, матэрыю, каляску, нават ванначку купілі, каб было ў чым купаць дзіцёнка. Сяброўкі радаваліся за яе, падбадзёрвалі і Зосі, як ніколі, хацелася жыць, вучыцца і гадаваць дзіцё. Яна нават пакінула думаць аб тым, што ў яго не будзе бацькі. Бацька ёсць, але хіба можна яго назваць бацькам, калі ён выракся сваёй крыві?

Год таму назад Зося пазнаёмілася з Паўлам. Пачалася любоў. Ён паабяцаў жаніцца, а як даведаўся, што яна зацяжарыла, пачаў вымушаць зрабіць аборт. Доўга ў Зосі змагаліся два пачуцці—любоў да Паўла і да дзіцёнка. Прагнасць мацярынства аказалася мацнейшай.

У дзіцячым садзе завода „Большэвік"—Менск (фота Раскіна).

У дзіцячых яслях кожзавода № 54, якія лічацца лепшымі сярод дзіцячых установ соўгасаў Гомельшчыны. (Белсаюзфото)

Вельмі ўзрадавалася Зося, калі сяброўкі прышлі. Яны абяцалі прыходзіць і дапамагаць у вучобе, пакуль падрасце дзіцё. Яна скончыць другі курс інстытута разам з усімі.

Зося распытвала пра навіны ў інстытуце. Занепакоілася, хто цяпер выконвае яе нагрузку культработніка групы і шкадавала, што яшчэ не хутка звернецца на работу. Дзяўчаты яе заспакойвалі:

— Гадаваць дзяцей у нас таксама грамадская нагрузка. А пакуль сядзі дома і ні аб чым не думай!

Каб даць спакой і недакучаць, яны яе пакінулі, паабяцаўшы часта наведваць. Цяпер Зося сядзела змораная, але шчаслівая. На сэрцы было лёгка і радасна.

Раптам пачуўся стук у дзверы. Увайшоў Павел. Ён суха прывітаўся і сеў на крэсла. Пайшло некалькі цяжкіх хвілін маўчання. Нарэшце Зося слабым голасам, нясмела, загаварыла:

— Ты не хочаш мяне прывітаць, дык я цябе прывітаю з бацькоўствам. А дзіцё якое здаровае ў нас! Мне нават прэмію ў 100 рублёў далі...

Нежданаву ад злосці хацелася абразіць яе, сказаць, што дзіцёнак не яго, і хутчэй адсюль пайсці, але Зося папярэдзіла:

— Няўжо ты яго ніколі не будзеш кахаць? Ён-жа твой!

Павел няёмка закруціўся на крэсле.

— Я не хацеў дзіцёнка і кахаць яго не магу!

— А лепш было-б, каб мяне скалечылі?.. Лепш, па твойму?

Павел нічога не адказаў. Паглядзеў на гадзіннік, узняўся з крэсла, вынуў з кішэні грошы і кінуў іх на ложак.

— Я пайду!.. Часу няма!

Ён накіраваўся да дзвярэй. Зося ўскочыла з ложку, абапіраючыся аб сцяну, рухам рукі падала знак спыніцца.

— Павел, ты-ж не бачыў дзіця... Пачакай, зараз прачнецца... Ты нават не пажадаў даведацца, сын ці дачка.

— Я не цікаўны,—нахабна адказаў Павел.

— Ты-ж нават не хочаш параіцца, як назваць яго.

— Для мяне ўсё роўна...

— Ты за грошы злуешся? Скажы, за грошы?

Павел маўчаў, утаропіўшыся поглядам у падлогу.

— Табе шкада іх? Дык вось, забяры назад!

Зося схапіла грошы і кінула іх у твар Паўлу.

— Забяры! Хіба мне грошы твае патрэбны? Я сама сына чалавекам зраблю. Дзяржава дапаможа. Мне тваё сумленне патрэбна, а не грошы, ты-ж яго бацька. Вырасце сын і запытаецца: „дзе тата?" Што яму адказаць? Адказаць, што ты аказаўся нягоднікам, ашукаў мяне і кінуў роднага сына...

— Ну, мне няма калі з табой лаяцца...—прамовіў Нежданаў і, не зачыніўшы дзвярэй, гулкімі крокамі пайшоў па калідору.

Зневажанай, разбітай, пакінутай адчула сябе Зося пасля ўходу Паўла. Гэта-ж здзек! А Павел-жа комсамолец! Ды гэткія-ж адносіны да шлюбу, да сям'і, да дзіцёнка несумяшчальны з прабываннем у комсамоле?!.

З болем у душы бадзялася Зося па пакоі. Ажывіў яе прыход бабулькі—жыхаркі той-жа кватэры, якая сама выклікалася дапамагаць юнай мацеры даглядаць дзіцянё.

А вось і малы прачнуўся. Уа, уа!—агаласіла пакой. Раскрыты як у галчонка раток гаварыў аб тым, што чалавек прагаладаўся.

— Ох, любы! Роўна тры гадзіны прайшло! Час табе і паесці!

Кволымі, бярэжлівымі рукамі прыціснула яна дзіцёнка да сябе, і праз мінуту гучнае чмоканне сведчыла аб тым, што маленькі чалавек атрымаў ад жыцця ўсё, чаго ён дамагаўся.

Зося і не заўважыла, як рыпнулі дзверы. Хтосьці паціху сеў на маленькі ўслончык, што стаяў ля ложаку.

— Павел, ты?—амаль ускрыкнула яна.

— Зося, сёння купаць яго будзем?

— Будзем, будзем, дзівачок ты мой!

І радасная ўсмешка асвятліла свежы, шчаслівы гвар юнай жанчыны.

НАМ ПІШУЦЬ

Выхоўваю ў дзецях ненавісць да ворагаў

У першыя дні арганізацыі вулічнага камітэта цяжка было працаваць. Не было актыва хатніх гаспадынь, з якімі можна было праводзіць масавую работу. Цяпер у нас арганізаван моцны актыў.

Мяне з пачатку не цікавіла гэта работа, але калі мне сталі даваць нагрузкі, я іх выконвала з вялікім жаданнем. Пастулова пачала ўцягвацца ў грамадскую работу. У сучасны момант з'яўляюся фінударніцай.

У мяне 6 дзяцей, з якіх 4 наведваюць сямігодку. Хатняй работы ў мяне многа, але не гледзячы на гэтую занятасць, хачу быць актывісткай.

Не так даўно я была яшчэ рэлігійнай, мела ў хаце абразы. Зараз я іх выкінула, бо мне сорамна стала перад сваімі дзецьмі комсамольцамі і піянерамі. На месцы абразоў дзеці зрабілі чырвоны куток.

Я абяцаю выхоўваць сваіх дзяцей у духу нянавісці да ўсіх эксплаататараў, усіх ашуканцаў народа і класавых ворагаў. Асаблівай нянавісцю напоўнена маё сэрца да трацкісцка-зіноўеўскай зграі, якая забіла Сергея Міронавіча Кірава і пасмела нават пакушацца на нашага таварыша Сталіна. Наш пролетарскі суд выканаў патрабаванне ўсяго совецкага народа і вынес прыгавор аб расстрэле ворагаў народа. Знішчыць гэтых гадаў, каб не пасмелі спадзявацца перашкодзіць нашаму велізарнаму будаўніцтву, якое так пераможна ідзе пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна і яго слаўных паплечнікаў!

МУХАРАВА.

Добруш.

Наш старшыня заўкома

У невялікім утульна абсталяваным пакоі, увешаным партрэтамі правадыроў і рознымі плакатамі, заўсёды ёсць наведвальнікі.

Што-б не здарылася ў рабочага, ці ў члена яго сям'і на электрастанцыі «Большэвік», ён заўсёды ідзе за парадай і дапамогай да старшыні заўкома Іды Фінкельштэйн. Тут кожны наведвальнік атрымоўвае таварыскую параду.

Зусім нядаўна парторганізацыя электрастанцыі вылучыла тав. Фінкельштэйн на гэту адказную работу.

Пастулова, крок за крокам, пачала яна ўзнімаць развалены працу заўкома, згуртоўваць навокал сябе моцны профсаюзны актыў. Зараз гэты актыў перавышае ўжо дваццаць чалавек. Сярод іх немала жанчын, і ўсе яны вельмі добра выконваюць дадзеныя ім нагрузкі.

Маня Дрэер—скарбнік заўкома—трымае ў належным парадку фінансавую гаспадарку. Бася Каган і Ліза Гармізэ акуратна збіраюць членскія ўзносы і т .д.

А зусім нядаўна Іда працавала ў цэху памочнікам машыніста.

— Я часта ўспамінаю, — гаворыць яна,—сваю турбіну. Я-ж яе ведала, як свае пяць пальцаў.

І Іда не хлусіць, яна сапраўды ведала турбіну, ведала кожны яе гук, па якому пазнавала, як працуе машына, які ў яе сёння «настрой». Тры гады прапрацавала Іда каля гэтай турбіны і таму так добра вывучыла ўсе яе «сакрэты».

— А цяпер, цяпер трэба разгортваць заўкомаўскую работу. Гэта-ж адказны участак. Тут патрэбна сапраўды бальшэвіцкая пільнасць, каб недапусціць ворага на нашу соцыялістычную фабрыку, у наш совецкі калектыў,—гаворыць Іда.

БАРАВІКОВА.

Бабруйск.

Гэтыя веды дапамогуць нам у патрэбны час

Я маю дачку і сына, якія вучацца на «выдатна». Не адстаю ад іх і я. Выконваю абавязкі старшыні вулічнага камітэта, правяла шмат мерапрыемстваў па санітарнаму ўпарадкаванню кватэр і вуліцы. Па абарончай рабоце арганізавала гурток ГСА.

Лепшая наша актывістка — хатняя гаспадыня—вылучана начальнікам санітарнай дружыны. Я была вылучана на курсы ПВХО, якія скончыла на «добра» і атрымала другую прэмію. Зараз я самастойна буду кіраваць гуртком ПВХО.

ЦЭЛІКАВА.

Жлобін.

Любоў да працы

На свінагадоўчай ферме соўгаса «Спаборніцтва» заўсёды вызначаецца ў рабоце 20-цігадовая скромная дзяўчына Ліза Ермакова. Пяць гадоў добрасумленна і аддана працуе яна на ферме.

Ліза добра разумее, што яна пастаўлена на важнейшым участку нашай народнай гаспадаркі—на развіцці соцыялістычнай жывёлагадоўлі, а гэта значыць—вырашаць мясную праблему, даць краіне як мага больш мяса.

Цяжкаваты былі першыя крокі работы Лізы. Яна не ведала, як трэба карміць свіней і як за імі даглядаць. Але маладая энергічная дзяўчынка стала настойліва працаваць над сабою. Пасля першага году работы яна ўжо заваявала сабе аўтарытэт сярод рабочых соўгаса. Дырэкцыя некалькі разоў прэміравала яе граматай, грашыма і мануфактурай.

Ліза сістэматычна наведвае заняткі зоатэхнічнага гуртка. Кожнае слова зоатэхніка Казначэўскай яна прадумвае і запамінае. Яна рэгулярна чытае кнігі па зоатэхніцы. Усё гэта дае відавочныя вынікі; яна працуе ўсё лепш і лепш.

Ліза Ермакова даглядае 20 свінаматак. У 1935 годзе яна атрымала ў сярэднім па 12 парасят ад свінаматкі. Добрым доглядам за жывёлай яна зусім знішчыла абартаванне.

— Я люблю сваю справу і таму працую не дрэнна,—скромна кажа Ліза.

Свіней Ліза корміць па строга распрацаванаму рацыёну і штодзённа ў аднолькавы час.

У стаханаўскі дэкаднік Ліза паказала ўзоры работы. Яе парасяты далі штодзённы прырост 355 грамаў супроць 300 грам, устаноўленых па норме.

Ліза служыць прыкладам для ўсіх рабочых. У яе заўсёды лепшыя паказальнікі ў рабоце. У гэтым годзе яна абавязалася выгадаваць ад кожнай свінаматкі ў сярэднім па 16 дзелавых парасят. І свае абавязкі яна выканае з гонарам, таму што ў нашай краіне праца—радасць.

ЛЕЙБОВІЧ.

Дубровенскі раён.

Як Міця захварэў брушным тыфусам

У школе панавала незвычайнае ажыўленне. Школьнікі бегалі каля габінета дырэктара, а адзін з іх паглядзеў у замочную шчыліну і ўсхвалявана паведаміў:

— Халат апранае!

Прычынай такога ўзбуджэння быў прыход урача ў незвычайны для яго час.

Многія выказвалі свае меркаванні ўголас:

— Відаць, будзе воспу прышчапляць?

— Прышчэпкі супроць воспы дзейнічаюць не менш як на пяць год, а нам яе нрышчаплялі месяц таму назад.

— Напэўна будзе аглядаць, каго паслаць у дом адпачынку!

— Хіба ў пачатку навучальнага году пасылаюць у дамы адпачынку? Ха-ха-ха, — засмяяліся вакол школьнікі.

— А можа будзе лекцыя?

— Калі-б была лекцыя, то нам-бы абвясцілі загадзя, як гэта заўсёды робіцца.

Меркаванняў было выказана вельмі многа. Раптам усе змоўклі. З габінета паказаўся дырэктар. Пры яго з'яўленні ўсе настаражыліся і з цікаўнасцю на яго ўставіліся.

— Перадайце, дзеці, па класах, каб усе сабраліся ў гімнастычнай залі.

Праз некалькі мінут велізарны гімнастычны зал быў поўны.

— Таварышы, —звярнуўся ўрач да школьнікаў,—у нашым горадзе за апошнія некалькі дзён медыцынскія ўстановы зарэгістравалі некалькі захворванняў брушным тыфусам. Захварэць брушным тыфусам не цяжка, бо брушна-тыфозная зараза, брушна-тыфозныя мікробы знаходзяцца ў сырой вадзе і могуць заразіць усю ваду. Мікробы гэтыя могуць быць на прадуктах, а больш за ўсё іх знаходзіцца ў выдзяленнях хворых. Пераносчыкам брушна-тыфознай заразы з'яўляюцца самі хворыя і галоўным чынам мухі. Мухі, сядаючы на выдзяленні хворых брушным тыфусам, пераносяць заразу з аднаго канца горада ў другі. Захворванне гэта вельмі цяжкое. У часе вялікіх эпідэмій брушны тыфус дае даволі вялікую смяротнасць. Бываюць выпадкі, што нават ачуняўшыя пасля брушнога тыфусу застаюцца на ўсё жыццё калекамі, бо гэта хвароба часта дае цяжкія ўскладненні.

Кожнага хворага брушным тыфусам неабходна неадкладна адправіць у больніцу,—бо, па-першае, ён небяспечны для акаляючых, а па-другое, для яго патрэбен больнічны догляд. Пакой і ўсе рэчы, быўшыя ў дачыненні да хворага, неабходна прадэзынфектаваць.

Для таго, каб не захварэць, трэба: 1) не піць сырой вады, 2) не есці немытых сырых фруктаў, 3) захоўваць абсалютную чыстату, 4) унікаць прастуды, 5) абараніць усе прадукты ад мух і 6) зрабіць папераджальную прышчэпку.

У сучасны момант найбольш важную ролю граюць прышчэпкі. Мы, большэвікі, зараз гаворым, што хварэюць брушным тыфусам толькі некультурныя людзі. А таму, каб папярэдзіць вас ад брушнога тыфуса, я зараз усім вам зраблю папераджальныя прышчэпкі. Гэтыя прышчэпкі абыходзяцца дзяржаве вельмі дорага. Але наш пролетарскі ўрад з гэтым не лічыцца, бо для яго здароўе працоўных даражэй за грошы. А цяпер разыходцеся па класах і чакайце мяне.

— Зноў будуць калоць,—абурыўшыся сказаў Міша Кастылёў.

— А ты-б лепей хацеў захварэць брушным тыфусам?—адгукнулася адразу некалькі галасоў.

— Падумаеш, вялікая справа гэтыя прышчэпкі! Я і без іх не захварэю,—працягваў бурчэць Міця.

Прышчэпкі былі зроблены ўсім школьнікам. Пасля сканчэння заняткаў, калі школьнікі натоўпамі разыходзіліся па дамах, Міця рассмяяўся на ўсю вуліцу:

— Хі-хі-хі, ха-ха-ха, хо-хо-хо!

— Чаго ты смяешся?

— Я ашукаў урача,—скрозь смех адказаў Міця таварышам.— Прышчэпкі я не рабіў, а адзначыўся, што зрабіў.

— Ну, і дурань,—абрэзалі яго таварышы. — Захварэеш, тады даведаешся—каго ты ашукаў—урача ці самаго сябе...

Прайшоў месяц. Усе ўжо даўно забыліся пра прышчэпкі. Толькі Міця іншы раз падражніваў таварышоў:

— Ну, хто дурань? Мяне не калолі, а я не захворваю брушным тыфусам, хаця і сырую ваду п'ю і ем сырыя фрукты.

Але аднаго разу раніцой Міця адчуў невялікі галаўны боль і слабасць. Не ў парадку быў і страўнік. На другі дзень к вечару ўзнялася тэмпература. У сям'і Міця хаваў свой стан, але сам спужаўся. Думка пра тыфус працінала мозг.

„Не, не, гэта напэўна просты грып",—супакойваў сябе Міця, але думка пра тыфус ўсё больш умацоўвалася ў яго свядомасці.

Агульная слабасць з кожным днём узмацнялася. Міця цяпер вельмі шкадаваў, што не зрабіў прышчэпкі. Цэлы дзень ён імкнуўся не трапляць матцы на вока.

— Няма часу мне,—казаў ён і выходзіў з дому, як толькі яна вярталася з работы дамоў.

Прайшло яшчэ некалькі дзён. Агульная слабасць стала яшчэ больш. Міця рашыў звярнуцца да ўрача. Той, уважліва агледзеў яго і запытаўся:

— Вам супроць брушнога тыфусу прышчэпку рабілі?

Міця пачырванеў і адказаў:

— Не...

— Не? Дзіўна! Мы прышчэпкі рабілі ўсім школьнікам. У вас брушны тыфус. Вам ужо даўно трэба было-б знаходзіцца ў больніцы.

Урач тут-жа выклікаў аўтамабіль хуткай дапамогі і адправіў Міцю ў больніцу, а мацеры пазваніў па тэлефону і паведаміў непрыемную вестку.

Міця праляжаў у больніцы каля двух месяцаў. Справа ў тым, што да ўрача ён звярнуўся позна і ў яго атрымалася некалькі ўскладненняў. Толькі дзякуючы выключна ўважлівым адносінам і надзвычайнаму догляду ў больніцы Міця застаўся жывы.

У палаце, дзе ляжаў Міця, былі амаль усе хворыя, не зрабіўшыя сабе папераджальных прышчэпак. Усе яны страшэнна шкадавалі аб сваім лёгкадумным учынку.

Выпісаўшыся з больніцы, Міця горача падзякаваў медыцынскіх работнікаў, даглядаўшых за ім у часе хваробы, а сваім бацькам даў урачыстае абяцанне ніколі больш не ашукваць урачоў.

Доктар В. А. Гузарэвіч.

9.2

Цана 20 кап.

У гэтым нумары бясплатна дасылаецца ўкладка-выкрайка.

Калгас імя Тэльмана, Дзяржынскага раёна. Загадчыца СТКФ — стаханаўка Ніна Чуеўская і стаханавец Вася Шымакевіч пасля работы катаюцца на лодцы. (Фота Салавейчыка).

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 952. Тыраж 9.775 Уп. Галоўлітбела № III—3309.
Здана ў набор 27/VIII—36 г. Падпісана да друку 13-IX—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.